# На тым тыдні...

## Ратуемся спадчынай

✓**З 1 снежня** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» працавала персанальная выстава **«Скрозь час»** мастака па касцюмах, члена Беларускага саюза мастакоў Наталлі Смаляк. Экспазіцыя складалася з трох асноўных частак. У першую ўвайшлі сцэнічныя касцюмы, створаныя паводле матываў гістарычных касцюмаў XVI – XVII стст., і ўяўляюць сучасны аўтарскі погляд на багатую і шматгранную культурную спадчыну Беларусі. Другая частка знаёміла з аўтарскімі сцэнічнымі касцюмамі, распрацаванымі паводле матываў народных строяў і народных вясельных касцюмаў канца XIX – пач. XX ст., што ўяўляюць сабой сучасную сцэнічную стылізацыю народнага касцюма, выкананую з выкарыстаннем традыцыйных тэхнік: ручнога ткацтва, вышыўкі, нашыўкі тасьмой і карункамі. У трэцяй частцы былі эскізы і фатаграфіі аўтарскіх сцэнічных касцюмаў і касцюмаў, распрацаваных мастаком непасрэдна для калектываў, што працуюць у тэатральных, музычных, харэаграфічных і інш. відах мастацтва.

У сферу інтарэсаў мастачкі ўваходзіць вывучэнне культурных традыцыяў і традыцыйных тэхнік гістарычнага і народнага касцюма, існаванне гэтых традыцыяў ва ўмовах сучаснасці, іх пераўтварэнне ў сучасныя сцэнічныя вобразы. Сцэнічныя касцюмы, створаныя Н. Смаляк, становяцца прадметам дыялогу паміж мінулым і будучыняй, спадчынай і сучаснасцю, традыцыяй і навацыяй.

✓У Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва **10 снежня** пачала працу выстава жывапісу **«На роднай зямлі»** членаў Беларускага саюза мастакоў Уладзіміра і Андрэя Ткачэнкаў. Гэта бацька і сын, настаўнік і вучань. Мастакі як розныя, так і падобныя. Першы – улюбёны ў лясны гушчар, пранізаны сонечным святлом, у лугі ды азёры, вясковыя вулкі, другі – гарадскі жыхар, якога прыцягваюць жыццё рэчаў, побытавыя сюжэты, вобразы сучаснікаў. У. Ткачэнка працуе ў станковым жывапісе ў жанрах пейзажа, нацюрморта, партрэта, кампазіцыі, апявае прыгажосць Міншчыны, Палесся, любімай Браслаўшчыны. А. Ткачэнка працуе алеем і акварэллю ў жанрах нацюрморта і партрэта.

Пабачыць творы можна па 10 студзеня 2021 г.

✓**11 снежня** ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь пачаў працу работу штогадовы выставачны праект **«Новы год. Анталогія свята»**. Незвычайная выстава пра ўсё тое, што лічыцца звычайным для Новага года. У яе межах архіўныя фотафакты і сведчанні размяшчаюцца побач з праектамі сучасных беларускіх мастакоў. У праекце «Снежань. № 12» Алена Данброва даследуе, як навагоднія традыцыі і стэрэатыпы здаўна захоўваліся і падтрымліваліся праз СМІ. Да снежаньскіх часопісаў 1950 – 1960-х гг. дадаюцца старыя фотаздымкі, што даюць магчымасць больш дэталёва адчуць той час.

На выставу шляхам адкрытага збору была сабрана значная колькасць фатаграфіяў з сямейных архіваў.

Праект «Персаніфікацыя селядзечніцы» Юрыя Тарэева, відэа «Дыхай» Аляксандры Салдатавай, карнавальная серыя Віктара Саўчанкі, працы іншых аўтараў, у тым ліку з музейнага збору НЦСМ, даследуюць рытмы і сімвалы свята, зімовага перыяду ў цэлым. Фотапраекты Альфрэда Мікуса і Віктара Ведзеня прысвечаныя адраджэнню ў сучаснай Беларусі старажытнага абраду калядавання.

Выставачны праект працягнецца па 7 лютага 2021 г.

✓Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага **12 снежня** запрасіла на святочную выставу **«Что растет на елке?»**, прысвечаную елачным цацкам савецкага перыяду. Экспанатамі сталі шары, фігуркі, гірлянды і навершшы, выпушчаныя ў 1940 – 1980-х гг. Большасць цацак належалі мінчанцы Алене Кастрыцкай і былі перададзеныя ў музей Дзмітрыем Новікавым. Прадстаўленыя вырабы з шкла, ваты, пластмасы, кардону. Дэманструюцца і больш рэдкія асобнікі: ватныя і шкляныя цацкі, што ўвасабляюць персанажаў казак, людзей розных прафесіяў і нацыянальнасцяў СССР. Музей таксама прапануе пагледзець рэпрадукцыі навагодніх выпускаў дзіцячых часопісаў 1957 – 1962 гг., архіўнае відэа з кадрамі сустрэчы Новага году ў першыя дзесяцігоддзі паваеннага Мінска.

Занурыцца ў атмасферу колішняга святкавання Новага году можна да 17 студзеня 2021 г.

✓**З 16 снежня** ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага пачала працаваць выстава прадметаў яўрэйскай культуры **«Тутэйшы Іерусалім»** з прыватнай калекцыі Ігара Сурмачэўскага.

Яўрэі з'явіліся на беларускіх землях у XIV ст., з XVI ст. пачалі масава перасяляцца ў беларускія гарады і мястэчкі. У выніку да пачатку Другой сусветнай вайны яны складалі амаль палову насельніцтва Мінска. Займаліся рознымі відамі рамёстваў, гандлем, а ў пачатку XX ст. узначальвалі многія банкаўскія канторы, выступалі заснавальнікамі прамысловых прадпрыемстваў, былі ўладальнікамі большасці гасцініц Мінска. Пры гэтым яны працягвалі захоўваць сваю культуру, мову і рэлігію.

У аснове калекцыі І. Сурмачэўскага – срэбныя кідушныя кубкі (больш за 100 з іх прадстаўлена ў экспазіцыі). Кідуш – гэта асвячэнне ці бенедыкцыя з падзякай Богу за дараваныя народу Ізраілеву святочныя дні і суботу (дзень адпачынку ці Шабат). Рытуал кідуш таксама з'яўляўся часткай яўрэйскага вяселля, калі малады і маладая пілі віно з аднаго кубка, які адрозніваўся ад астатніх кідушных сасудаў тым, што быў на ножцы і быў падобны на старажытнагрэчаскую вазу – кратэр. Выраблялі срэбныя кідушы, графіны і сподкі вядомы ювелір са Шклова Ізраэль Ёселевіч Захадэр, яго спадкаемец Гірш Раўкін. На выставе падстаўленыя таксама срэбныя вырабы мінскіх і полацкіх ювеліраў (падсвечнікі, кідушы, лыжкі).

Экспануецца Тора на пергаменце з Валожына, срэбная карона з літарай ש на Тору з Гродна. Сапраўды каштоўным і рарытэтным прадметам можна лічыць Кнігу-гербарый з травамі і кветкамі Іерусаліма 1890 г. Асобны раздзел экспазіцыі прысвечаны побытавай культуры мінскіх яўрэяў: гісторыя кухні, медны посуд, інсталяцыя інтэр'ера.

Выстава працуе да 28 лютага 2021 г.




✓**З 17 снежня** па 15 студзеня Музей гісторыі горада Мінска запрашае вучняў пачатковай школы ўзяць удзел у навагоднім квэсце **«В поисках волшебного ключа»**, што праходзіць у сядзібным доме, дзе ў XIX ст. жыў калекцыянер Юрый Кабылінскі (цяпер тут размешчаны музей). Каларытны інтэр'ер, цікавыя музейныя прадметы – усё для непаўторнай атмасферы маленькіх даследчыкаў. Яны наведаюць гасціныя, бібліятэку, кабінет, майстэрню мастака, адкажуць на пытанні, што тычацца экспанатаў. А таксама будуць маляваць, танцаваць, гуляць, лічыць.

*Скарыстаная інфармацыя з паведамленняў Музея гісторыі горада Мінска, Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва, мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў (Мінск, вул. Някрасава, 3)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ